НАША ПАМЯЦЬ

# Годна прайшоў адмераны шлях



Праца з дзецьмі была ў радасць педагогу.



З маладосці Васіль СУШЧЭНЯ быў настойлівым, мэтанакіраваным, сапраўдным патрыётам.

**Амаль 80 гадоў мінула з таго часу, як адгрымелі апошнія залпы самай страшнай, бязлітаснай вайны мінулага стагоддзя. Але і дагэтуль шчыміць сэрца ў тых, хто зведаў жахі, пакуты, страту блізкіх, дарагіх людзей. Бо тыя, хто перажыў ліхалеццe, ніколі не здолеюць закрэсліць яго ў сваёй памяці.**

Да апошняга ўздыху выбухі, пажары, грукат кулямётных чэргаў, гул самалётаў-бамбардзіроўшчыкаў не давалі спакою і Васілю Паўлавічу Сушчэні (не стала 15 сакавіка 1995 года). Ён нарадзіўся на хутары Мочын, што знаходзіўся недалёка ад вёскі Калінаўкі. У 1941-м скончыў 8 клас Малагарадзяціцкай школы. Якраз у той час пачалі «раскідваць» хутары, і Васіль разам з бацькамі перабраўся ў Калінаўку. Толькі абуладкаваліся там, як нечаканая вестка пра напад гітлераўцаў ураз перакрэсліла ўсе надзеі, чаканні і спакойнае, размеранае жыццё. Страх, невядомасць, адчай – гэтыя пачуцці сталі пастаяннымі спадарожнікамі вяскоўцаў, у тым ліку і падлеткаў. Але яны, як і дарослыя, не жадалі мірыцца з новым парадкам, што імкнуліся ўстанавіць ворагі.

І калі пачаў разгортвацца партызанскі рух, Васіль далучыўся да лясных мсціўцаў. Змагаўся з карнікамі ў складзе атрада імя Кутузава, арганізаванага ў студзені 1943 года з ліку жыхароў в. Калінаўка, а камандзірам яго з'яўляліся адразу К.М. Дзяшковіч, а потым Д.П. Бародзька. Разам з іншымі адважнымі аднавяскоўцамі юнак супрацьстаяў карнікам: хадзіў у разведку, удзельнічаў у падрыве чыгункі.

А ў ліпені 1944-га, пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі, Васіль Паўлавіч добраахвотнікам пайшоў на фронт.

– Як і многія мае таварышы, я папоўніў 293-і стралковы полк. Быў першым нумарам станкавага кулямёта ў першай кулямётнай роце, у саставе якой прымаў удзел у баях за Слонім, – прыгадваў пасля наш зямляк.

А далей яго шлях пралёг у напрамку Польшчы, Усходняй Прусіі.

**Цяжка злічыць, колькі разоў даводзілася патрыёту знаходзіцца пад знішчальным варожым агнём, граміць моцныя фашысцкія бастыёны і вызваляць ад карычневай навалы гарады і сёлы.**

У прыватнасці, падчас фарсіравання Буга разлік з пяці чалавек, сярод якіх быў і В.П. Сушчэня, адбіў 10 гітлераўскіх контратак. За мужнасць і гераізм усе задзейнічаныя байцы былі прадстаўлены да ўзнагароды і адзначаны медалямі «За баявыя заслугі», а Васіль Паўлавіч – ордэнам Славы III ступені.

«Кожны момант вайны памятны па-свойму, – казаў ён. – Але асабліва запомнілася фарсіраванне ракі Одэр. Гэта была апошняя буйнейшая водная перашкода на шляху да Берліна. Рака шырокая і паўнаводная. Фашысцкія самалёты бамбілі амаль бесперапынна. Шмат страт мы тады панеслі. Але мэтанакіравана ішлі наперад. Па-іншаму нельга было».

Разлік Сушчэні ў выніку адбіў 8 контратак. За праяўленыя абаронцам смеласць і стойкасць пры выкананні воінскага абавязку ён удастоены ордэна Славы II ступені. Але так атрымалася, што навіну пра ўзнагароджванне наш зямляк сустрэў у шпіталі ў горадзе Інстэрбургу. А трапіў туды ў красавіку 1945-га: фашысцкая куля прабіла левую руку.

Акрыяўшы, Васіль Паўлавіч быў накіраваны ў асобны інжынерны сапёрны батальён пісарам-каптэнармусам, займаўся рэгістрацыяй канцылярскіх папер, загадваў зброяй і боепрыпасамі. Напрыканцы красавіка 1947 года нарэшце дэмабілізаваны.

Баявыя заслугі адважнага партызана і франтавіка адзначаны не толькі вышэйназванымі ўзнагародамі, але і ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Кёнігсберга» і іншымі. Звыш дзесятка іх аздаблялі пінжак, калі ўдзельнічаў пасля ва ўрачыстых мітынгах.



Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся
БССР
ПАСВЕДЧАННЕ № 107527
Сушчэня
Васіль Паўлавіч
сапраўды ўдзельнічаў у партызанскім руху на Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны з 20 ліпеня 1943 г.
па ліпень 1944 г. у якасці
радавога атр. імя Кутузава,
бр. №25 імя Панамаранкі
Мінскай вобл.
Старшыня выканкома
Любанскага
раённага Савета
дэпутатаў працоўных
А. Запутнап

Пролетарии всех стран, соединяйтесь
БССР
УДОСТОВЕРЕНИЕ № 107527
Сущеня
Василий Павлович
действительно участвовал в партизанском движении в Белоруссии в период Великой Отечественной войны с 20 июля 1943 г.
по июль 1944 г. в качестве
рядовой отр. им. Кутузова,
бр. № 25 им. Пономаренко
Минской обл.
Председатель исполкома
Любанского
районного Совета
депутатов трудящихся
А. Запутний
М. П. «17» февраля 1970 г.



Награжден орденом
Славы III степени № ордена 167022
Славы II степени 12425
УДОСТОВЕРЕНИЕ УЧАСТНИКА ВОЙНЫ ВРУЧЕНО
Имеет право, начиная с декабря 1944 г. на получение орденских денежных выдач и на другие льготы и преимущества, согласно „Общему положению об орденах Союза ССР“.
Секретарь Президиума Верховного Совета СССР А. Горкин
19 ноября 1946 г.
А № 348575

ИЗВЛЕЧЕНИЯ
из „Общего положения об орденах Союза ССР“ (утверждено постановлением ЦИК и СНК Союза ССР от 7 мая 1936 г.).
1. Орден Союза ССР является высшей наградой за особые заслуги в области социалистического строительства и обороны Союза ССР.
3. Орденами Союза ССР могут награждаться как отдельные граждане, так и войсковые соединения и воинские части Рабоче-Крестьянской Красной Армии, предприятия, учреждения и организации.
4. Награжденные орденом Союза ССР могут быть за новые заслуги повторно награждены тем же или другим орденом Союза ССР.
10. Награжденные орденом Союза ССР пользуются лично правом бесплатного про-
8

Да слова, як ратны шлях, так і прафесійны наш зямляк прайшоў годна. Пасля ліхалецця паступіў на завочнае аддзяленне Мінскага педагагічнага вучылішча, а неўзабаве перавёўся ў Слуцкае, якое скончыў у 1952 годзе па спецыяльнасці «настаўнік пачатковых класаў». Потым у сталічным індустрыяльна-педагагічным тэхнікуме адвучыўся яшчэ на педагога працоўнага навучання. І звыш трох дзесяцігоддзяў Васіль Паўлавіч руплiва шчыраваў на ніве адукацыі Любаншчыны: адразу ў Малагарадзяціцкай, а затым у Калінаўскай школе, дзе выкладаў працоўнае навучанне, выяўленчае мастацтва і фізічнае выхаванне. Любіў сваю справу, дзетак, прывіваў юным вяскоўцам павагу да людзей, працавітасць, адказнасць за ўласныя ўчынкі і ўлюбёнасць у родныя мясціны, што калісьці бараніў ад ворага і мілейшых за якія для Васіля Сушчэні не было.

**Наталля ВІЛЕНТА.**